лярность местных мастеров, но и придаст существенный толчок развитию туристического потенциала Городокщины. Это поможет существенно повысить охват публики и повысить популярность коллектива среди жителей Беларуси и мира. Особо стоит отметить огромные усилия в исследовательской и методической работе, которые помогают по крупицам восстановить исторические формы художественного ремесла и служить делу восстановления исторической памяти не только Городокского района, но и всего белорусского народа в целом.


1. Гаравая Людміла Генадзьеўна. – URL: https://omcnt.by/garavaya-lyudmila-genadze%D1%9Ena/ (дата обращения: 19.08.2024).
2. Даведка аб творчай дзейнасці Заслужанага аматарскага калектыву Рэспублікі Беларусь народнага клуба майстроў народных мастацкіх раместваў "Вытокі" філіяла «Гарадоцкі Дом раместваў і фальклору» ДУК «Цэнтр традыцыйнай культуры і народнай творчасці Гарадоцкага раена». – Городок, 2021. – 6 с.
3. Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь. – URL: http://gosspisok.gov.by/Home/Index (дата обращения: 12.08.2024).
4. Міснікава Таццяна Уладзіміраўна. – URL: https://omcnt.by/misnikava-taczczyana-uladzimira%D1%9Ena/ (дата обращения: 20.08.2024).
5. Сапотько, П. М. Сохранение и возрождение народных промыслов и ремесел в контексте государственной культурной политики Республики Беларусь / П. М. Сапотько // Актуальные проблемы и перспективы развития декоративно-прикладного искусства : материалы научно-практической конференции, посвященной 25-летию образования кафедры народного декоративно-прикладного искусства Белорусского государственного университета культуры и искусств, Минск, 21-22 ноября 2018 г. / Белорусский государственный университет культуры и искусств. - Минск, 2020. - С. 140-147.
6. Сіманковіч Васіль Паўлавіч. – URL: https://omcnt.by/simankovich-vasil-pa%D1%9Elavich/ (дата обращения: 18.08.2024).


## ДА ПЫТАННЯ АБ АСАБЛІВАСЦЯХ ТВОРЧАСЦІ ПРАДСТАЎНІКОЎ ВІЦЕБСКАЙ МАСТАЦКАЙ ШКОЛЫ НА ПРЫКЛАДЗЕ ЭЛЬ ЛІСІЦКАГА


***Гефцер Л.М.,***
*аспірант трэцяга года навучання, ВДУ імя П.М. Машэрава,*
*г. Віцебск, Рэспубліка Беларусь*
*Навуковы кіраўнік – Ізафатава К.В., канд. мастацтвазнаўства*



Ключавыя словы. Яўрэйскае мастацтва, Эль Лісіцкі, Віцебская мастацкая школа, творчасць, ХХ стагоддзе.

Keywords. Jewish art, El Lisitsky, Vitebsk art school, creation, XX century.


Праблематыка яўрэйскага мастацтва з'яўляецца адным з аспектаў гісторыі развіцця Віцебскай мастацкай школы.

Мэта даследавання – выяўленне асаблівасцяў творчасці Эль Лісіцкага як прадстаўніка яўрэйскага мастацтва ў генезісе Віцебскай мастацкай школы.

**Матэрыял і метады.** Матэрыяламі для артыкула паслужылі працы навукоўцаў, дзе творчасць Эль Лісіцкага аналізуецца і з пункту гледжання яго звароту да яўрэйскай выяўленчай традыцыі, і з пункту гледжання існавання яго мастацтва ў межах авангарда. Таксама мы карысталіся артыкулам Лісіцкага «Успамін пра Магілеўскую сінагогу» [1] і артыкулам Г. Казоўскага «Яўрэйскі перыяд Эль Лісіцкага» [2]. У аснову нашага артыкула пакладзены апісальна-аналітычны метад даследавання.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** У першай палове ХХ стагоддзя яўрэйскія мастакі абіралі розныя шляхі каб выразіць уласную ідэнтычнасць ў мастацтве: побытавая тэматыка, кніжная ілюстрацыя, рэмінісцэнцыі фальклору і ўжытковага мастацтва.

Творчая эвалюцыя Эль Лісіцкага і яго погляды на яўрэйскае мастацтва з'яўляюцца цікавымі, бо працу мастака можна разглядаць як з пункту гледжання наватарскага мастацтва ХХ стагоддзя, так і ідэалагічных поглядаў майстра.

Творчы шлях Э. Лісіцкага пачынаўся са звароту да яўрэйскай выяўленчай традыцыі, ен з'яўляўся ўдзельнікам этнаграфічных экспедыцый.

«У пачатку ХХ стагоддзя многія маладыя яўрэйскія мастакі з энтузіязмам займаліся вывучэннем уласнай спадчыны. Гэта абумовіла цэлы этап творчай эвалюцыі яўрэяў-авангардыстаў, які прыйшоўся на сярэдзіну 1910-х гадоў і для якога было характэрна зразуменне і выкарыстанне нацыянальных асноў выяўленчага мастацтва» [цыт. па: 3].

Мастак стварыў сваю пластычную мову, чэрпаючы натхненне ў фальклоры. У сваіх працах ен аднолькава надаваў увагу як фармальнай творчасці, так і семантыцы. Галоўная задача ў мастацтве для яго–стварэнне новага. Для сталага Эль Лісіцкага абстракцыя–гэта аснова сучаснага мастацтва, якая транслiруе праз сябе новыя ідэі, а не спосабу васаблення нацыянальных форм.

На ранніх этапах творчасці ўплыў яўрэйскай традыцыі мацней усяго прасочваецца ў кніжнай графіцы. Яскравым прыкладам з'яўляюцца ілюстрацыі Лісіцкага да паэмы М. Брадэрзона «Пражская легенда», ілюстрацыі да яўрэйскай казкі «Козачка» і інш.

Важна адзначыць, што пераход Лісіцкага да супрэматычных элементаў у ілюстрацыі адбываўся паступова, а не стыхійна.

У супрэматызм Эль Лісіцкі прыйшоў на этапе яго пранікнення ў архітэктурныя формы і менавіта Лісіцкі змог перавесці супрэматызм з плоскасці ў прадметна-прасторавы свет.

У сваей творчасці ен выкарыстоўваў прыемы і сродкі выразнасці з розных напрамкаў і стыляў у мастацтве. Як правіла, ен не размяжоўваў розныя плыні, а аб'ядноўваў іх. Інтэграцыя адбывалася не толькі на ўзроўні пластычнай мовы і формаў, але таксама і на ўзроўні семантыкі. Яскравы прыклад–сінтэз супрэматызму і канструктывізму, канцэпцый, якія супярэчаць адна адной.

Лісіцкі быў канструктарам кнігі «Пра два квадраты. Супрэматычнае станаўленне ў 6-ці пабудовах». Мастак упершыню ўводзіць супрэматычныя элементы ў дзіцячую кнігу, укараняе яе новае візуальнае ўспрыманне.

На больш позніх этапах творчасці зварот да яўрэйскай выяўленчай традыцыі практычна знікае з яго творчасці. Розныя даследчыкі разглядаюць Эль Лісіцкага як мастака савецкага авангарда, аднаго з заснавальнікаў яўрэйскага мадэрнізму і яскравага прадстаўніка інтэрнацыянальнага еўрапейскага авангарда.

**Заключэнне.** Як прадстаўнік Віцебскай мастацкай школы, у позні перыяд творчасці, Лісіцкі цікавіўся не фальклорнымі традыцыямі ці арнаментамі сінагог, а рэальнай рэчаіснасцю. «Згодна з вопытам віцебскіх мастакоў, яўрэйскае мастацтва вызначаецца імкненнем адлюстраваць сваю прыналежнасць да яўрэйскай абшчыны не шляхам актыўных дзеянняў, звязаных з яўрэйскай мастацкай рэвалюцыяй, а ўласным поглядам на рэальнасць» [цыт. па: 4].

1. Лісіцкі, Э. Успаміны пра Магілеўскую сінагогу / Э. Лісіцкі. – URL: http://mogjewshistory.ru (дата звароту: 04.10.2024).
2. Казоўскі, Г. Яўрэйскі перыяд Эль Лісіцкага: артыкул / Г. Казоўскі. – URL: https://syg.ma/grighorii-kazovskii-ievrieiskii-period-elia-lisitskogho (дата звароту: 04.10.2024).
3. Шацкіх, А. С. Габрэі ў рускім авангардзе: артыкул / А. С. Шацкіх. – URL: https://artpark.gallery/be/article/1701 (дата звароту: 04.10.2024).
4. Фоль Ле, К. Віцебская мастацкая школа (1897-1923) / К. Ле Фоль. – Мінск: Прапілеі, 2007. – 240 с.

## СПЕЦИФИКА ОБРАЗОВАТЕЛЬНОГО ПРОЦЕССА В СИСТЕМЕ ДОПОЛНИТЕЛЬНОГО ОБРАЗОВАНИЯ ДЕТЕЙ И МОЛОДЕЖИ

***Губанова Т.В.,***
*аспирант третьего года обучения, ВГУ имени П.М. Машерова,*
*г. Витебск, Республика Беларусь*
*Научный руководитель – Федьков Г.С., канд. пед. наук, доцент*

Ключевые слова. Система дополнительного образования детей и молодежи, образовательный процесс, учащиеся, изобразительное искусство.

Keywords. The system of additional education for children and youth, the educational process, students, visual art.

Системе дополнительного образования детей и молодежи Республики Беларусь отведена значительная роль в образовательном пространстве. В процессе обучения формируются ценности, мотивация, профессиональное самоопределение, мировоззрение, граж-